**Л.ДЗЯМЕШКА**
прафесар кафедры
менеджменту інфармацыйна-
дакументнай сферы
Беларускага дзяржаўнага
універсітэта культуры і мастацтваў

# Роля бібліятэкі ў станаўленні асобы дзіцяці



## Дзіця, чытанне, бібліятэка

**Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, якая адбылася ў лістападзе 2010 года па ініцыятыве ДУ «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска» з шырокім удзелам бібліятэчных спецыялістаў Рэспублікі Беларусь, замежных прадстаўнікоў з Расіі, Польшчы, была прысвечана дзейнасці дзіцячых бібліятэк як цэнтраў атрымання інфармацыі для дзяцей і юнацтва. Канферэнцыя высветліла важнейшую праблему сучаснасці - «дзіця, чытанне, бібліятэка».**

У грамадстве ведаў, да якога крочыць XXI стагоддзе, станаўленне асобы дзіцяці з'яўляецца не толькі гуманным ідэалам, але і набывае характар заканамернага развіцця чалавецтва. Ва ўмовах хуткага ўкаранення мультымедыйных рэсурсаў, інтэрнэт-тэхналогій, шматлікага патоку візуальнай інфармацыі чытанне і бібліятэка з'яўляюцца галоўным сродкам фарміравання духоўнай культуры, інтэлектуальнага развіцця, формай камунікатыўнай пазнавальнай дзейнасці. Станаўленне асобы пачынаецца з дзяцінства, і ў гэтым сэнсе вялікая роля адведзена бацькам, выхавацелям, настаўнікам, бібліятэкарам.

Але вось размова двух жанчын у гарадскім транспарце, сведкай якой стаў аўтар:

— Вчёра у моего Егорки был день рождения. Наконец-то мы ему подарили компьютер.

— А я сво м купила энциклопедию. Посмотрели картинки - и все. Читать не заставишь.

— А зачем заставлять? Пусть школьную программу читают.

На жаль, такое меркаванне сустракаецца даволі часта. Сапраўды, на погляд абывацеля, навошта дзіцяці чытаць кніжкі, калі ёсць камп'ютэр, відэа, Інтэрнэт, тэлебачанне? Дзяцей захапляе і хвалюе высокая хуткасць перадачы інфармацыі, парушэнне ёю ўсялякіх межаў. Мадэлі навучання сучасных школьнікаў удасканальваюцца з кожным днём.

Вучоныя ўжо вывелі матэматычна рацыянальную тэорыю інтэлекта, якая дазваляе ў пэўнай меры кіраваць развіццём свядомасці, стварае канцэпцыі мыслення.

Быць разумным можна навучыць. Але... «матэматыка» інтэлекта, на наш погляд, не ўключаецца без граматыкі фантазіі. Чалавецтва за ўвесь час свайго існавання не прыдумала лепшага спосабу для развіцця ўяўленняў і інтэлекта, чым чытанне.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

Чытанне становіцца ўплывае і на развіццё, і на выхаванне, садзейнічае ўзаемапаразуменню бацькоў і дзяцей. Бібліятэка, якая ўтрымлівае багатыя інфармацыйныя рэсурсы, прафесійна падрыхтаваныя кадры, валоданне разнастайнымі тэхналогіямі і методыкамі ўздзеяння на чытанне, вядома, аказвае адукацыйна-выхаваўчае ўздзеянне на развіццё і станаўленне асобы дзіцяці.

Але размова можа ісці аб тых дзецях, якія ўжо пазнаёміліся з бібліятэкай, сталі чытачамі, адчулі асалоду ў чытанні, разумеюць сэнс прачытанага. А першапачатковае захапленне чытаннем вядома закладваецца ў сям'і з першымі дзіцячымі кніжкамі, побач з бацькамі, якія чытаюць і разумеюць сэнс бібліятэкі. Менавіта ў асяроддзі чытаючай сям'і фарміруецца ў дзіцяці патрэба у чытанні. На гэтым шляху існуе шмат перашкод. Бацькі часцей за ўсё занятыя сваімі праблемамі, а дзецям даступныя розныя віды культур - больш лёгкія і захапляльныя (віртуальная, электронная). Кожная з іх перанасычана масавай эрзац-культурай (баявікамі, ужасцікамі, эротыкай і інш.). Невыпадкова ў дзіцячых садках з'яўляюцца гульні ў монстраў, піратаў і да таго падобныя. Паўстае праблема: як абараніць дзяцей ад субкультуры, як захапіць іх карысным чытаннем, паказаць перавагі бібліятэкі ў развіцці і станаўленні асобы чалавека? Бо, як бачым, часта чытанне адыходзіць на апошні план. Цікавыя парады па рабоце з бацькамі прадстаўлены былі на канферэнцыі Іалантай Словак, намеснікам дырэктара публічнай бібліятэкі г. Вроцлава (Польшча) - праекты «Мама і я ў бібліятэцы», «Бібліятэка дзіцяці», «Для добрага пачатку», «Пакет для дзіцяці», «Ад камп'ютэра - да кніжак»; Церахавай Л.Ю. (Расія) - «Кніжны мост паміж светам дарослых і светам дзяцей»; Звягінцавай В.В. (Расія) - аб рэалізацыі ўбібліятэках медыяпраектаў і інш. Яны сведчаць аб празмерным захапленні з маленства дзяцей камп'ютэрнымі гульнямі. Добра гэта ці дрэнна? Вядома, ёсць камп'ютэрныя гульні, якія развіваюць дзіцячую творчасць, навучаюць асновам навук, як, напрыклад, адукацыйныя і навучальныя праграмы. Але празмернае захапленне імі зніжае чытацкую актыўнасць і часта шкодзіць здароўю дзіцяці. Сучасныя даследаванні ў розных краінах сведчаць пра змяншэнне інтарэсу дзяцей і падлеткаў да чытання. Адзначана найбольшая іх зацікаўленасць візуальнай інфармацыяй, масавае захапленне Інтэрнэтам, камп'ютэрнымі гульнямі, кіно, відэа, тэлепраграмамі. На захадзе гэты працэс акрэслілі як «крызіс чытання». Цікава прасачыць яго праявы ў розных краінах.



У Германіі, згодна з сацыялагічнымі даследаваннямі, дзеці 9-11 гадоў звяртаюцца да СМІ ў сярэднім тры гадзіны ўдзень. Першую палову гэтага часу займае прагляд тэлепраграм, другую - камп'ютэрныя гульні, праслухоўванне аўдыёкасет. У 12-13-гадовым узросце час на камп'ютэрныя гульні павялічваецца да двух гадзін у дзень, а на чытанне змяншаецца да 0,5 гадзіны.

У Францыі 25% рэспандэнтаў 8-16 гадоў за тры месяцы не прачыталі ніводнай кнігі, а сярод 14-16-гадовых гэты працэнт павялічыўся да 33. Пры гэтым кожны другі падлетак лічыць чытанне цяжкім і непатрэбным абавязкам.

У ЗША адзначаны негатыўны ўплыў тэлебачання на выхаванне дзяцей. Баявікі, дэтэктывы, рэкламныя застаўкі, героі якіх вядуць сябе асацыяльна, грэбуюць граматыкай, правільным вымаўленнем слоў, не спрыяюць добраму выхаванню. Чытанне дзяцей і падлеткаў зніжаецца з кожным годам.

У Японіі новае пакаленне «дзяцей тэлебачання» назвалі «тэрэбіко»: з 10-гадовага ўзросту дзеці рэгулярна глядзяць перадачы, прызначаныя для дарослых, і чытачоў сярод іх амаль не назіраецца.

У Расіі даследчыкі сведчаць аб тым, што ў малодшых школьнікаў адсутнічае стабільная звычка да чытання. У падлеткаў чытанне займае толькі пятае месца ў бюджэце іх вольнага часу.

Такая праблема існуе і ў Беларусі, аб чым сведчыць даследаванне «Дзіцячае чытанне ў Рэспубліцы Беларусь, сучасны стан і тэндэнцыі развіцця», першапачатковыя вынікі якога агучыла на канферэнцыі загадчыца навукова-даследчым аддзелам бібліятэказнаўства НББ М.Г. Алейнік.

Усе гэтыя матэрыялы выклікаюць занепакоенасць і ставяць праблему: як зрабіць бібліятэку цэнтрам развіцця асобы дзіцяці, як яго прыцягнуць да бібліятэкі, як утрымаць і развіваць яго зацікаўленасць? На наш погляд, асаблівую ўвагу набывае знаходжанне, вырашэнне і стымуляванне становіцца ўплыву візуальнай інфармацыі на чытанне. Інакш кажучы, неабходна знайсці сімбіёз візуальнай, электроннай і чытацкай культуры, вызначыць іх падабенства і адрозненні, узаемапранікненне і ўзбагачэнне.

Расійскі сацыёлаг С.А. Плотнікаў на прыкладзе захаплення дзяцей і падлеткаў камп'ютэрнымі гульнямі і «відзікамі» (тэлебачаннем) вылучае тры адметнасці: *тып увагі, асаблівасці зместу, характар успрымання.* Дзеці, якія шмат часу праводзяць перад тэлевізарам ці за камп'ютэрам, уваходзяць у свет чытання больш нецярплівымі і рассеянымі. Іх чытацкае развіццё запавольваецца. З'явіўся «лянівы чытач», якому лягчэй прагледзець кнігу, малюнкі, азнаёміцца з коміксамі, дзе больш ілюстрацый, чым тэксту. Чытанне для такіх дзяцей «цяжкая работа», яны больш прывыклі да забаўляльнай інфармацыі, а не паслядоўнага чытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ